# ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
# **АБ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЯХ**

Праект для грамадскага абмеркавання

28.08.2022

# ЗМЕСТ


ГЛАВА 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ 3

ГЛАВА 2. ПАРАДАК СТВАРЭННЯ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ 4

ГЛАВА 3. ДЗЯРЖАЎНАЯ РЭГІСТРАЦЫЯ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ, ІХ СІМВОЛІКІ, ЗМЯНЕННЯЎ І (АБО) ДАПАЎНЕННЯЎ, ЗАНЕСЕНЫХ У СТАТУТЫ ПАРТЫЙ. РЭАРГАНІЗАЦЫЯ І ЛІКВІДАЦЫЯ ПАРТЫЙ 8

ГЛАВА 4. ПРАВЫ І ЎМОВЫ ДЗЕЙНАСЦІ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ 15

ГЛАВА 5. СРОДКІ ДЫ ІНШАЯ МАЁМАСЦЬ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ 16

ГЛАВА 6. ДЗЯРЖАЎНАЕ ФІНАНСАВАННЕ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ 19

ГЛАВА 7. АДКАЗНАСЦЬ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ 22

ГЛАВА 8. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ 24

Праект (новая рэдакцыя), 28.08.2022

# ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# Аб палітычных партыях

Гэты Закон накіраваны на рэалізацыю канстытуцыйнага права грамадзян на свабоду аб'яднанняў у палітычныя партыі, а таксама на ўстанаўленне прававых і арганізацыйных асноў стварэння, дзейнасці, рэарганізацыі і (або) ліквідацыі палітычных партый.

## ГЛАВА 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

### Артыкул 1. Паняцце палітычнай партыі

1. Палітычная партыя (партыя) – гэта добраахвотнае аб'яднанне грамадзян Рэспублікі Беларусь, якое ставіць перад сабой палітычныя мэты, стымулюе актыўны ўдзел грамадзян у кіраванні справамі грамадства і дзяржавы, садзейнічае выяўленню і выказванню палітычнай волі грамадзян з мэтай прадстаўлення іх інтарэсаў у органах дзяржаўнай улады і мясцовага самакіравання, якое ўдзельнічае ў выбарах і іншых палітычных мерапрыемствах.

2. Палітычныя партыі з'яўляюцца некамерцыйнымі арганізацыямі.

### Артыкул 2. Права на свабоду аб'яднання ў палітычныя партыі

1. Права грамадзян на свабоду аб'яднання ў палітычныя партыі гарантуецца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь.

2. Грамадзяне Рэспублікі Беларусь маюць права свабодна ўступаць у партыі, удзельнічаць у іх дзейнасці і выходзіць з іх.

### Артыкул 3. Забарона абмежавання правоў і свабод грамадзян у сувязі з іх прыналежнасцю ці непрыналежнасцю да палітычнай партыі

1. Прыналежнасць або непрыналежнасць да партыі, яе падтрымка або ўдзел у яе дзейнасці не можа служыць падставай для абмежавання правоў і свабод, а таксама для перашкоды выкананню ўстаноўленых законам абавязкаў, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных артыкулам 10 гэтага Закона.

2. Прыналежнасць або непрыналежнасць грамадзяніна да партыі не могуць служыць падставай для прадастаўлення або непрадастаўлення яму дзяржавай ільгот і пераваг.

3. Не дапускаецца патрабаванне указання ў афіцыйных дакументах прыналежнасці або непрыналежнасці грамадзяніна да той ці іншай партыі, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных гэтым Законам.

### Артыкул 4. Асноўныя прынцыпы дзейнасці палітычных партый

1. Палітычныя партыі дзейнічаюць на аснове прынцыпаў свабоды аб'яднання, дэмакратызму, законнасці, галоснасці, самакіравання і раўнапраўя.

2. Партыі вядуць сваю дзейнасць у адпаведнасці са сваімі статутамі і праграмамі, якія з'яўляюцца агульнадаступнымі.

3. Партыі свабодныя ў вызначэнні сваёй унутранай структуры, мэтаў, формаў і метадаў дзейнасці, за выключэннем абмежаванняў, устаноўленых гэтым Законам.

**Артыкул 5. Дзяржава і палітычныя партыі**

1. Умяшанне органаў дзяржаўнай улады і мясцовага самакіравання, іх службовых асоб у дзейнасць партый, роўна як і ўмяшанне партый у дзейнасць органаў дзяржаўнай улады і мясцовага самакіравання, іх службовых асоб, не дапускаецца, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных законам.

2. Службовыя асобы органаў дзяржаўнай улады і мясцовага самакіравання не маюць права выкарыстоўваць перавагі свайго службовага становішча ў інтарэсах партыі, сябрамі якой яны з'яўляюцца, або ў інтарэсах любой іншай партыі.

3. У мэтах садзейнічання якаснаму дзяржаўнаму кіраванню дзяржава падтрымлівае развіццё партый. З гэтай мэтай гэтым Законам і іншымі нарматыўнымі прававымі актамі ўстанаўліваюцца прававыя механізмы функцыянавання партый і іх арганізацыйных структур, а таксама фінансавання партый з дзяржаўнага бюджэту і недзяржаўных крыніц.

4. Дыскрымінацыя партый пры аказанні дзяржаўнай падтрымкі не дапускаецца.

5. Дзяржаўная падтрымка партый ажыццяўляецца толькі на падставах, устаноўленых законам.

**Артыкул 6. Абмежаванні пры стварэнні і дзейнасці палітычных партый**

1. На тэрыторыі Рэспублікі Беларусь не могуць ствараецца і дзейнічаць палітычныя партыі, калі іх праграмныя мэты ці дзеянні накіраваныя на:

1.1. ліквідацыю незалежнасці, парушэнне суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці Рэспублікі Беларусь;

1.2. гвалтоўную змену канстытуцыйнага ладу;

1.3. прапаганду вайны, расавай, нацыянальнай, рэлігійнай ці іншай сацыяльнай варожасці ці нянавісці;

1.4. незаконны захоп і ўтрыманне дзяржаўнай улады.

2. На тэрыторыі Рэспублікі Беларусь не могуць ствараецца і дзейнічаць палітычныя партыі іншых дзяржаваў і іх арганізацыйныя структуры.

3. Арганізацыйная структура партый будуецца толькі па тэрытарыяльным прынцыпе. Стварэнне арганізацыйных структур партыі па вытворчым прынцыпе і на працоўных месцах не дапушчаецца.

4. Партыям забараняецца ўзбройваць сваіх сябраў ці іншых асоб, арганізоўваць ваенную падрыхтоўку і ствараць ваенізаваныя фармаванні.

5. Ідэалогія палітычнай партыі не можа ўсталёўвацца ў якасці дзяржаўнай або абавязковай для грамадзян.

## ГЛАВА 2. ПАРАДАК СТВАРЭННЯ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ

**Артыкул 7. Стварэнне палітычных партый**

1. У якасці заснавальнікаў палітычнай партыі маюць права выступаць грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія валодаюць канстытуцыйным правам выбіраць.

2. Для стварэння партыі неабходна не менш за 500 заснавальнікаў, якія пражываюць у не менш як у трох абласцях Рэспублікі Беларусь і горадзе Мінску.

3. Рашэнне аб стварэнні партыі прымаецца на агульным сходзе заснавальнікаў (далей – устаноўчы сход) або на з'ездзе ўпаўнаважаных прадстаўнікоў заснавальнікаў (далей – устаноўчы з'езд). Дэлегатамі з'езда могуць быць толькі заснавальнікі.

4. Устаноўчы сход партыі правамоцны, калі на ім прысутнічае больш за палову ад складу заснавальнікаў. Устаноўчы з'езд партыі правамоцны, калі на ім прысутнічае больш за палову ад вылучаных дэлегатаў і пры гэтым у з'ездзе павінны прыняць удзел не менш за 100 заснавальнікаў.

5. На ўстаноўчым сходзе (з'ездзе) прымаецца рашэнне аб стварэнні партыі, зацвярджаецца яе назва і статут, прымаецца праграма і абіраюцца органы партыі.

6. Пратакол устаноўчага сходу (з'езда) аб стварэнні партыі павінен змяшчаць наступныя звесткі:

6.1. дата і месца правядзення ўстаноўчага сходу (з'езда);

6.2. рашэнне аб абранні старшыні (старшыняў) і сакратара (сакратароў) сходу (з'езда);

6.3. рашэнне аб стварэнні партыі;

6.4. рашэнне аб зацвярджэнні назвы і скарочанай назвы партыі;

6.5. рашэнне аб зацвярджэнні статута і праграмы партыі;

6.6. рашэнне аб абранні кіраўнічых і кантрольна–рэвізійных органаў партыі ў адпаведнасці з зацверджаным статутам.

7. Неад'емнай часткай пратакола з'яўляецца спіс асобаў, якія ўдзельнічалі ва ўстаноўчым сходзе (з'ездзе) партыі. Спіс удзельнікаў устаноўчага сходу (з'езда) партыі павінен змяшчаць наступныя даныя: прозвішча, імя, імя па бацьку, дата нараджэння, грамадзянства, асабісты подпіс заснавальніка.

8. Пратакол устаноўчага сходу (з'езда) партыі падпісваецца яго старшынёй (старшынямі) і сакратаром (сакратарамі).

9. Заснавальнікі партыі становяцца яе чальцамі (сябрамі) з моманту дзяржаўнай рэгістрацыі партыі.

**Артыкул 8. Статут палітычнай партыі**

1. Статут палітычнай партыі павінен быць адкрытым для ўсеагульнага азнаямлення, у тым ліку шляхам размяшчэння на сайце рэгіструючага органа і павінен змяшчаць:

1.1. поўную і скарочаную назву партыі на беларускай і рускай мовах;

1.2. мэты партыі;

1.3. умовы і парадак набыцця, прыпынення і страты сяброўства ў партыі, а таксама парадак уліку сяброў партыі;

1.4. правы і абавязкі сяброў партыі;

1.5. умовы і парадак стварэння і спынення дзейнасці арганізацыйных структур партыі;

1.6. пералік органаў кіравання і кантролю партыі і яе арганізацыйных структур, парадак іх утварэння, іх паўнамоцтвы і тэрмін паўнамоцтваў;

1.7. парадак прыняцця і абскарджвання рашэнняў органаў партыі і яе арганізацыйных структур;

1.8. крыніцы і парадак фармавання грашовых сродкаў ды іншай маёмасці партыі, правы яе органаў па распараджэнні маёмасцю, межы распараджэння маёмасцю партыі яе арганізацыйнымі структурамі, парадак ажыццяўлення фінансавага аўдыту;

1.9. парадак унясення змяненняў і (або) дапаўненняў у статут партыі, а таксама ў праграму партыі;

1.10. парадак рэарганізацыі і ліквідацыі партыі і парадак выкарыстання маёмасці, якая засталася пасля ліквідацыі партыі.

2. У статуце партыі могуць змяшчацца і іншыя палажэнні, якія не супярэчаць заканадаўству, але якія датычацца стварэння і дзейнасці партыі.

**Артыкул 9. Праграма палітычнай партыі**

Палітычная партыя павінна мець сваю праграму, якая вызначае каштоўнасці і прынцыпы дзейнасці партыі, яе праграмныя мэты і задачы, а таксама шляхі іх дасягнення.

**Артыкул 10. Сяброўства у палітычных партыях і іх абмежаванні**

1. Сяброўства ў палітычнай партыі з'яўляецца добраахвотным, індывідуальным і фіксаваным.

2. Прыём у партыю ажыццяўляецца на падставе пісьмовай заявы, у тым ліку праз выкарыстанне электронных лічбавых подпісаў з выкананнем патрабаванняў заканадаўства, у парадку, прадугледжаным статутам партыі.

3. Сябрам партыі можа быць толькі грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь мае права выбіраць.

4. Сяброўства ў партыі не можа быць абмежавана па прыкметах прафесійнай, сацыяльнай, расавай, нацыянальнай ці рэлігійнай прыналежнасці, а таксама не можа залежаць ад полу і маёмаснага становішча.

5. Суддзі не могуць быць сябрамі палітычных партый.

6. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь прыпыняе сяброўства ў палітычнай партыі на ўвесь тэрмін паўнамоцтваў.

7. Сябры палітычных партый, якія з'яўляюцца пракурорскімі работнікамі, супрацоўнікамі органаў унутраных справаў і органаў бяспекі, ваеннаслужачымі не могуць удзельнічаць у партыйных і палітычных мерапрыемствах, выступаць у падтрымку якой–небудзь партыі, знаходзячыся ў ваеннай або іншай устаноўленай для дадзенай службы форме.

8. Сябры партыі маюць права абіраць і быць абранымі ў кіраўнічыя і кантрольна-рэвізійныя органы партыі, яе арганізацыйныя структуры, атрымліваць інфармацыю аб дзейнасці партыі, яе арганізацыйных структур і іх кіраўнічых органаў, а таксама абскарджваць рашэнні і дзеянні ўказаных органаў у парадку, прадугледжаным статутам партыі.

9. Сябра палітычнай партыі мае права свабоднага выхаду з партыі.

10. Грамадзянін Рэспублікі Беларусь можа быць сябрам толькі адной палітычнай партыі. Сябра партыі можа знаходзіцца на партыйным уліку толькі ў адной арганізацыйнай структуры гэтай партыі, як правіла, па месцы жыхарства.

11. Колькасны склад сяброў партыі не можа парушаць патрабаванняў, устаноўленых пунктам 2 артыкула 7 гэтага Закона для колькаснага складу заснавальнікаў партыі.

**Артыкул 11. Назва і сімволіка палітычных партый**

1. Назва палітычнай партыі павінна ўключаць слова «партыя». Юрыдычнай асобе, якая не з'яўляецца палітычнай партыяй, забараняецца выкарыстанне слова «партыя» ў яе ўласнай назве.

2. Назва арганізацыйнай структуры палітычнай партыі павінна змяшчаць указанне на назву партыі, структурным падраздзяленнем якой яна з'яўляецца.

3. У назве палітычнай партыі, яе арганізацыйных структур не дапускаецца выкарыстанне:

3.1. афіцыйных назваў (як поўных, так і скарочаных) дзяржаваў ці дзяржаваў, якія раней існавалі;

3.2. імя фізічнай асобы – пры адсутнасці заявы такой асобы (у выпадку яе смерці – заявы яе спадкаемцаў) аб дачы згоды на выкарыстанне ў назве палітычнай партыі імя гэтай асобы.

4. Палітычная партыя можа мець сцяг, эмблему, нагрудныя і апазнавальныя знакі ды іншую сімволіку, якія засноўваюцца ў парадку, устаноўленым заканадаўствам і яе статутам.

5. У якасці сімволікі палітычнай партыі не дапускаецца выкарыстанне:

5.1. дзяржаўных сімвалаў Рэспублікі Беларусь і сімвалаў яе адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, а таксама сімвалаў замежнай дзяржавы або дзяржавы, якая раней існавала;

5.2. выява фізічнай асобы – пры адсутнасці заявы такой асобы (у выпадку яе смерці – заявы яе спадкаемцаў) аб дачы згоды на выкарыстанне ў сімволіцы палітычнай партыі выявы гэтай асобы;

5.3. сімвалаў, выкарыстанне якіх абмежавана законам.

6. Назва партыі, у тым ліку скарочаная, і яе сімволіка павінны істотна адрозніваецца ад назваў і сімволікі іншых партый і іншых юрыдычных асоб, зарэгістраваных у Рэспубліцы Беларусь, і не павінны супярэчыць гэтаму Закону, іншым актам заканадаўства, статуту партыі, а таксама парушаць правы на інтэлектуальную ўласнасць.

7. Калі партыя змяніла назву, была рэарганізаваная з іншай назвай або ліквідаваная, то іншым партыям забараняецца паўторна выкарыстоўваць поўную і скарочаную назву, а таксама сімвалы такой партыі на працягу 10 гадоў.

**Артыкул 12. Органы палітычнай партыі. Арганізацыйныя структуры палітычнай партыі і іх органы**

1. Вышэйшым органам палітычнай партыі з'яўляецца з'езд. Партыйныя з'езды склікаюцца не радзей за адзін раз на чатыры гады.

2. Вышэйшы орган палітычнай партыі:

2.1. уносіць у статут партыі змяненні і (або) дапаўненні, калі іншае не прадугледжана гэтым артыкулам;

2.2. выбірае ў адпаведнасці са Статутам кіраўнічы орган партыі, які ажыццяўляе кіраўніцтва дзейнасцю партыі ў перыяд паміж пасяджэннямі вышэйшага органа партыі;

2.3. выбірае кантрольна–рэвізійны орган партыі, які ажыццяўляе ўнутраную праверку фінансава–гаспадарчай дзейнасці партыі, а таксама ўнутраны кантроль за адпаведнасцю дзейнасці партыі заканадаўству і яе статуту;

2.4. прымае праграму партыі, уносіць у яе змяненні і (або) дапаўненні;

2.5. прымае рашэнні аб рэарганізацыі або ліквідацыі партыі, калі іншае не прадугледжана гэтым Законам;

2.6. прымае іншыя рашэнні, абавязковыя для ўсіх органаў і сяброў партыі.

3. Кіраўнічы орган партыі складаецца не менш як з трох сяброў партыі.

4. Кіраўнічы орган партыі ў перыяд паміж пасяджэннямі вышэйшага органа партыі мае права ўносіць у статут партыі змяненні і (або) дапаўненні, абумоўленыя зменамі ў заканадаўстве.

5. Палітычная партыя можа ствараць свае арганізацыйныя структуры, якія дзейнічаюць на падставе статута партыі.

6. Арганізацыйныя структуры партыі ў адпаведнасці са статутам партыі, структурнымі падраздзяленнямі якой яны з'яўляюцца, могуць надзяляцца правамі юрыдычнай асобы.

7. Вышэйшым органам арганізацыйнай структуры партыі ў адпаведнасці са статутам партыі з'яўляецца агульны сход ці канферэнцыя.

8. Вышэйшы орган арганізацыйнай структуры палітычнай партыі:

8.1. выбірае ў адпаведнасці са Статутам партыі кіраўнічы орган арганізацыйнай структуры, які ажыццяўляе кіраўніцтва яе дзейнасцю ў перыяд паміж пасяджэннямі вышэйшага органа арганізацыйнай структуры;

8.2. выбірае кантрольна–рэвізійны орган арганізацыйнай структуры;

8.3. прымае рашэнні, абавязковыя для органаў арганізацыйнай структуры і сяброў, якія ўваходзяць у партыю.

9. Кіраўнічыя і кантрольна–рэвізійныя органы палітычнай партыі, яе арганізацыйных структур з'яўляюцца выбарнымі органамі. У выбарныя органы партыі, яе арганізацыйныя структуры могуць быць абраныя толькі сябры гэтай партыі. Не дапускаецца адначасовае заняцце сябрам партыі пасад у кіраўнічым і кантрольна–рэвізійным органах партыі, яе арганізацыйныя структуры.

10. Палітычная партыя, яе арганізацыйныя структуры маюць права ўтвараць іншыя органы, неабходныя для ажыццяўлення статутнай дзейнасці. Парадак утварэння такіх органаў, іх кампетэнцыя і парадак прыняцця імі рашэнняў вызначаюцца статутам партыі.

11. Статутам можа быць прадугледжана правядзенне ўнутраных рэферэндумаў па палітычных пытаннях, якія маюць значэнне для партыі. Рэферэндумы па пытаннях, якія, паводле статута, з'яўляюцца кампетэнцыяй вышэйшага органа партыі, праводзяцца толькі па рашэнні апошняга.

## ГЛАВА 3. ДЗЯРЖАЎНАЯ РЭГІСТРАЦЫЯ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ, ІХ СІМВОЛІКІ, ЗМЯНЕННЯЎ І (АБО) ДАПАЎНЕННЯЎ, ЗАНЕСЕНЫХ У СТАТУТЫ ПАРТЫЙ. РЭАРГАНІЗАЦЫЯ І ЛІКВІДАЦЫЯ ПАРТЫЙ

**Артыкул 13. Парадак рэгістрацыі палітычных партый і іх сімволікі**

1. Дзяржаўная рэгістрацыя палітычнай партыі ажыццяўляецца Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь.

2. Для дзяржаўнай рэгістрацыі палітычнай партыі ў месячны тэрмін з дня правядзення ўстаноўчага сходу (з'езда) партыі ў Міністэрства юстыцыі прадстаўляюцца:

2.1. заява аб дзяржаўнай рэгістрацыі партыі, падпісаная кіраўніком партыі або іншай асобай, упаўнаважанай на тое ў адпаведнасці са статутам партыі, з указаннем прозвішча, імя, імя па бацьку, адраса для паштовай карэспандэнцыі ў якасці юрыдычнага адраса палітычнай партыі, нумара тэлефона ды іншых спосабаў сувязі;

2.2. статут і праграма партыі ў двух асобніках без натарыяльнага засведчання, іх электронная копія;

2.3. пратакол устаноўчага сходу (з'езда);

2.4. спіс заснавальнікаў партыі, у якім указаныя прозвішча, імя, імя па бацьку, дата нараджэння, грамадзянства, адрас месца жыхарства, ідэнтыфікацыйны нумар, нумар тэлефона, асабісты подпіс кожнага з яе заснавальнікаў;

2.5. спісы сяброў выбарных органаў партыі, у якіх указаныя прозвішча, імя, імя па бацьку, дата нараджэння, грамадзянства, адрас месца жыхарства, нумар тэлефона ды іншыя спосабы сувязі, пасады ў гэтых выбарных органах;

2.6. заява грамадзяніна (у выпадку яго смерці – заява яго спадчыннікаў) аб дачы згоды на выкарыстанне ў назве партыі імя гэтага грамадзяніна (толькі пры ўключэнні імя гэтага грамадзяніна ў назву партыі);

2.7. плацёжны дакумент, які пацвярджае выплату дзяржаўнай пошліны (за выключэннем выпадкаў вызвалення ад яе выплаты, прадугледжаных заканадаўчымі актамі).

3. Праграма партыі прадстаўляецца выключна для азнаямлення рэгіструючага органа. Любыя памылкі, недакладнасці ў праграме партыі не могуць служыць падставай для адмовы ў дзяржаўнай рэгістрацыі палітычнай партыі, за выключэннем парушэння патрабаванняў пункта 1 артыкула 6 гэтага Закона. Міністэрству юстыцыі забараняецца патрабаваць ад партыі ўнясення якіх–небудзь зменаў у яе праграму.

4. Заява аб дзяржаўнай рэгістрацыі палітычнай партыі разглядаецца Міністэрствам юстыцыі ў месячны тэрмін з дня яе паступлення.

5. У выпадку, калі заявы аб дзяржаўнай рэгістрацыі палітычнай партыі падалі дзве або больш партыі, якія маюць адну і тую ж назву, перавага аддаецца партыям, якія раней за іншых падалі заявы аб дзяржаўнай рэгістрацыі пад гэтай назвай, а іншым партыям прапануецца змяніць назву.

6. Міністэрства юстыцыі мае права ажыццяўляць праверку дакладнасці дакументаў, якія прадстаўляюцца для дзяржаўнай рэгістрацыі партыі.

7. Па выніках разгляду дакументаў, прадстаўленых для дзяржаўнай рэгістрацыі, Міністэрства юстыцыі прымае адно з наступных рашэнняў:

7.1. аб дзяржаўнай рэгістрацыі палітычнай партыі;

7.2. аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі палітычнай партыі.

8. Запісы аб дзяржаўнай рэгістрацыі палітычнай партыі ўносяцца Міністэрствам юстыцыі ў Адзіны дзяржаўны рэгістр юрыдычных асоб і індывідуальных

прадпрымальнікаў у дзень прыняцця рашэння аб дзяржаўнай рэгістрацыі ў парадку, устаноўленым заканадаўствам.

9. Міністэрства юстыцыі на працягу пяці рабочых дзён з дня ўнясення запісу аб дзяржаўнай рэгістрацыі палітычнай партыі ў Адзіны дзяржаўны рэгістр юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў выдае дакументы, якія пацвярджаюць пастаноўку на ўлік у падатковых органах, органах дзяржаўнай статыстыкі, органах Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь у парадку, які вызначаецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

10. Дзяржаўная рэгістрацыя сцягоў, эмблем, нагрудных і апазнавальных знакаў палітычнай партыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам аб дзяржаўнай рэгістрацыі афіцыйных геральдычных сімвалаў.

11. Зарэгістраванай партыі выдаецца пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі палітычнай партыі і адзін асобнік статута партыі, на якім робіцца адзнака аб дзяржаўнай рэгістрацыі палітычнай партыі.

**Артыкул 14. Прыпыненне дзяржаўнай рэгістрацыі, адмова ў дзяржаўнай рэгістрацыі палітычнай партыі**

1. Дзяржаўная рэгістрацыя палітычнай партыі можа быць прыпынена Міністэрствам юстыцыі на тэрмін да аднаго месяца ў выпадку неадпаведнасці прадстаўленых дакументаў і (або) звестак патрабаванням заканадаўства, калі такое парушэнне мае выпраўляльны характар.

2. Пасля прадстаўлення партыяй адпаведных дакументаў і звестак або заканчэння месячнага тэрміну прыпынення дзяржаўнай рэгістрацыі палітычнай партыі, разгляд Міністэрствам юстыцыі прадстаўленых дакументаў ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым гэтым Законам.

3. Рашэнне аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі палітычнай партыі прымаецца ў выпадку:

3.1. парушэння ўстаноўленага парадку стварэння партыі;

3.2. неадпаведнасці статута партыі патрабаванням заканадаўства;

3.3. прадстаўлення партыяй падложных, падробленых або несапраўдных дакументаў;

3.4. неадпаведнасці назвы партыі, у тым ліку скарочанай, умовам сяброўства ў партыі патрабаванням заканадаўства і (або) яе статуту.

4. Міністэрства юстыцыі ў пяцідзённы тэрмін з дня прыпынення дзяржаўнай рэгістрацыі або прыняцця рашэння аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі палітычнай партыі ў пісьмовай форме паведамляе аб прынятым рашэнні заяўніку, з указаннем падстаў для прыпынення або адмовы, якія павінны змяшчаць:

4.1. канкрэтныя палажэнні гэтага Закона, якія паслужылі падставай для прыпынення або адмовы ў дзяржаўнай рэгістрацыі палітычнай партыі;

4.2. вычарпальны пералік неадпаведнасцяў дакументаў, прадстаўленых на дзяржаўную рэгістрацыю, Канстытуцыі і законам Рэспублікі Беларусь. Пры гэтым у кожным выпадку ўказваецца, якому канкрэтнаму палажэнню нарматыўнага прававога акта не адпавядае прадстаўлены дакумент і ў чым выяўляецца гэтая неадпаведнасць.

5. Калі дзяржаўная рэгістрацыя палітычнай партыі не ажыццёўлена ў тэрмін, прадугледжаны гэтым Законам, або прынята рашэнне аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі па матывах, якія, на думку заснавальнікаў (кіраўнічага органа) партыі, не

маюць падставаў, яны могуць абскардзіць прынятае рашэнне ў судовым парадку ў адпаведнасці з Грамадзянскім працэсуальным кодэксам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 15. Дзяржаўная рэгістрацыя і спыненне дзейнасці арганізацыйных структур палітычнай партыі**

1. Арганізацыйныя структуры палітычнай партыі, надзеленыя правамі юрыдычнай асобы, падлягаюць дзяржаўнай рэгістрацыі.

2. Дзяржаўная рэгістрацыя арганізацыйнай структуры партыі ажыццяўляецца галоўным упраўленнем юстыцыі абласнога, Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта па месцы знаходжання кіраўнічага органа гэтай арганізацыйнай структуры (далей – адпаведнае ўпраўленне юстыцыі) у парадку, устаноўленым гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства.

3. Для дзяржаўнай рэгістрацыі арганізацыйнай структуры партыі кіраўнічым органам гэтай партыі ў трохмесячны тэрмін з дня прыняцця ва ўстаноўленым парадку рашэння аб стварэнні арганізацыйнай структуры ў адпаведнае ўпраўленне юстыцыі прадстаўляюцца:

3.1. заява аб дзяржаўнай рэгістрацыі арганізацыйнай структуры партыі, падпісаная кіраўніком партыі ці іншай асобай, упаўнаважанай на тое ў адпаведнасці са статутам партыі, з указаннем адраса для паштовай карэспандэнцыі ў якасці юрыдычнага адраса арганізацыйнай структуры партыі;

3.2. спісы сяброў выбарных органаў арганізацыйнай структуры партыі, у якіх указаныя прозвішча, імя, імя па бацьку, дата нараджэння, грамадзянства, адрас месца жыхарства, нумар тэлефона ды іншыя спосабы сувязі, пасады ў гэтых выбарных органах;

3.3. плацёжны дакумент, які пацвярджае выплату дзяржаўнай пошліны (за выключэннем выпадкаў вызвалення ад яе выплаты, прадугледжаных заканадаўчымі актамі).

4. У выпадку непрадстаўлення партыяй усіх дакументаў, прадугледжаных часткай трэцяй гэтага артыкула, адпаведнае ўпраўленне юстыцыі адмаўляе ў прыняцці заявы аб дзяржаўнай рэгістрацыі арганізацыйнай структуры партыі.

5. Адпаведнае ўпраўленне юстыцыі запытвае пры неабходнасці ў Міністэрстве юстыцыі электронную копію статута партыі. Кіраўнічы орган партыі мае права самастойна прадставіць копію статута.

6. Па выніках разгляду дакументаў, прадстаўленых для дзяржаўнай рэгістрацыі арганізацыйнай структуры партыі, адпаведнае ўпраўленне юстыцыі на працягу сямі дзён з дня падачы кіраўнічым органам партыі адпаведнай заявы прымае адно з наступных рашэнняў:

6.1. аб дзяржаўнай рэгістрацыі арганізацыйнай структуры партыі;

6.2. аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі арганізацыйнай структуры партыі.

7. На працягу дзесяці працоўных дзён пасля дзяржаўнай рэгістрацыі арганізацыйнай структуры партыі, надзеленай правамі юрыдычнай асобы, адпаведнае ўпраўленне юстыцыі паведамляе аб гэтым у падатковыя органы, органы дзяржаўнай статыстыкі, органы Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь. Запіс аб дзяржаўнай рэгістрацыі арганізацыйнай структуры партыі, надзеленай правамі юрыдычнай асобы, уносіцца Міністэрствам юстыцыі ў Адзіны дзяржаўны рэгістр юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў у парадку, устаноўленым заканадаўствам.

8. Зарэгістраванай арганізацыйнай структуры партыі выдаецца пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі.

9. Дзяржаўная рэгістрацыя арганізацыйнай структуры партыі можа быць прыпынена адпаведным упраўленнем юстыцыі на тэрмін да аднаго месяца ў выпадку неадпаведнасці прадстаўленых дакументаў патрабаванням заканадаўства, калі такое парушэнне мае ўстараняльны характар.

10. Рашэнне аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі арганізацыйнай структуры палітычнай партыі прымаецца ў выпадку:

10.1. неадпаведнасці прадстаўленых дакументаў патрабаванням заканадаўства, калі такое парушэнне носіць неадхільны характар;

10.2. неадпаведнасці назвы арганізацыйнай структуры патрабаванням заканадаўства і (або) статуту партыі.

11. Адпаведнае ўпраўленне юстыцыі ў пяцідзённы тэрмін з дня прыпынення дзяржаўнай рэгістрацыі арганізацыйнай структуры партыі або прыняцця рашэння аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі арганізацыйнай структуры партыі ў пісьмовай форме паведамляе аб прынятым рашэнні ў кіраўнічы орган партыі з указаннем падставаў для прыпынення або адмовы.

12. Калі дзяржаўная рэгістрацыя арганізацыйнай структуры партыі не ажыццёўлена ў тэрмін, прадугледжаны гэтым Законам, або прынята рашэнне аб адмове ў дзяржаўнай рэгістрацыі арганізацыйнай структуры партыі па матывах, якія не маюць падставаў на думку кіраўнічага органа, ён можа абскардзіць прынятае рашэнне ў судовым парадку ў адпаведнасці з Грамадзянскім працэсуальным кодэксам Рэспублікі Беларусь.

13. Спыненне дзейнасці арганізацыйных структур палітычных партый здзяйсняецца:

13.1. у выпадку ліквідацыі (рэарганізацыі) партыі;

13.2. па рашэнні органа партыі, упаўнаважанага на тое яе статутам, аб ліквідацыі арганізацыйнай структуры партыі.

**Артыкул 16. Месцазнаходжанне палітычнай партыі і яе арганізацыйных структур**

1. Месцазнаходжаннем кіраўнічых органаў і арганізацыйных структур палітычных партый павінна быць тэрыторыя, якая знаходзіцца пад юрысдыкцыяй Рэспублікі Беларусь.

2. Юрыдычным адрасам партыі (арганізацыйнай структуры партыі) з'яўляецца адрас, указаны ў Адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў.

3. Калі дакументы, інфармацыя або іншая карэспандэнцыя накіроўваецца партыі (арганізацыйнай структуры партыі) па юрыдычным адрасе, указаным у Адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, лічыцца, што партыя (арганізацыйная структура партыі) атрымала гэтыя дакументы, інфармацыю або іншую карэспандэнцыю на працягу дзесяці дзён з моманту іх адпраўкі, калі адпраўнік можа даказаць, што ён ці яна адправілі адпаведную карэспандэнцыю.

4. У выпадку змянення юрыдычнага адраса партыі (арганізацыйнай структуры партыі) такая партыя (арганізацыйная структура партыі) на працягу дзесяці рабочых

дзён з дня змянення юрыдычнага адраса абавязана накіраваць у рэгіструючы орган паведамленне па форме, устаноўленай Міністэрствам юстыцыі.

**Артыкул 17. Парадак дзяржаўнай рэгістрацыі змяненняў і (або) дапаўненняў, унесеных у статут палітычнай партыі**

1. Дзяржаўная рэгістрацыя змяненняў і (або) дапаўненняў, унесеных у статут палітычнай партыі, ажыццяўляецца Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь у парадку, устаноўленым для дзяржаўнай рэгістрацыі палітычнай партыі.

2. Для дзяржаўнай рэгістрацыі змяненняў і (або) дапаўненняў, унесеных у статут партыі, у Міністэрства юстыцыі ў месячны тэрмін з дня іх унясення прадстаўляюцца:

2.1. заява аб дзяржаўнай рэгістрацыі змяненняў і (або) дапаўненняў, унесеных у статут партыі, падпісаная кіраўніком партыі або іншай асобай, упаўнаважанай на тое ў адпаведнасці са статутам партыі;

2.2. пратакол пасяджэння органа, правамоцнага ўносіць змяненні і (або) дапаўненні ў статут партыі;

2.3. змяненні і (або) дапаўненні ў двух асобніках, афармленыя ў выглядзе дадатку да статута, без натарыяльнага засведчання, электронная копія гэтага дадатку. Калі змяненні і (або) дапаўненні ўнесеныя ў выглядзе дадатку да статута больш як тры разы, а таксама калі змяненні, якія ўносяцца, і (або) дапаўненні складаюць больш за палову тэксту статута, для дзяржаўнай рэгістрацыі патрабуецца прадстаўленне статута ў новай рэдакцыі ў двух асобніках без натарыяльнага засведчання, яго электроннай копіі. Статут можа быць прадстаўлены ў новай рэдакцыі таксама з уласнай ініцыятывы партыі;

2.4. арыгінал статута партыі, у выпадку неабходнасці яго замены;

2.5. плацёжны дакумент, які пацвярджае выплату дзяржаўнай пошліны (за выключэннем выпадкаў вызвалення ад яе выплаты, прадугледжаных заканадаўчымі актамі).

3. Для дзяржаўнай рэгістрацыі змяненняў і (або) дапаўненняў, унесеных у статут партыі і якія датычацца змянення поўнай і (або) скарочанай назвы партыі, акрамя дакументаў, указаных у пункце 2 гэтага артыкула, у Міністэрства юстыцыі прадстаўляюцца:

3.1. пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі палітычнай партыі;

3.2. заява грамадзяніна (у выпадку яго смерці – заяву яго спадчыннікаў) аб дачы згоды на выкарыстанне ў назве партыі імя гэтага грамадзяніна (толькі пры ўключэнні імя гэтага грамадзяніна ў назву партыі);

3.3. дакумент аб аплаце за паведамленне аб змяненні поўнай і (або) скарочанай назвы партыі ў дадатку да юрыдычнага навукова–практычнага часопіса «Юстыцыя Беларусі».

**Артыкул 18. Парадак рэарганізацыі і ліквідацыі палітычнай партыі**

1. Рэарганізацыя палітычнай партыі ажыццяўляецца па рашэнні вышэйшага органа партыі ў парадку, устаноўленым заканадаўчымі актамі. Дзяржаўная рэгістрацыя рэарганізаваных партый ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым гэтым Законам для дзяржаўнай рэгістрацыі палітычных партый.

2. Ліквідацыя палітычнай партыі ажыццяўляецца:

2.1. па рашэнні вышэйшага органа партыі;

2.2. па рашэнні суда ў выпадках, прадугледжаных артыкулам 32 гэтага Закона.

3. Ажыццяўленне аперацый па рахунках партыі, у адносінах да якой прынята рашэнне аб ліквідацыі, не звязаных з ліквідацыяй, не дапускаецца. Не дапускаецца таксама здзяйсненне іншых дзеянняў, не звязаных з ліквідацыяй.

4. Грашовыя сродкі ды іншая маёмасць ліквідаванай партыі пасля поўнага задавальнення ўсіх патрабаванняў крэдытораў выкарыстоўваюцца на мэты, прадугледжаныя статутам гэтай партыі, калі яе грашовыя сродкі і іншая маёмасць у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі не падлягаюць звароту ў даход дзяржавы.

5. Калі рашэннем суда аб ліквідацыі палітычнай партыі на партыю або орган, упаўнаважаны на ліквідацыю партыі яе статутам не былі ўскладзеныя абавязкі па ажыццяўленні ліквідацыі партыі, ліквідацыйная камісія (ліквідатар) ствараецца (назначаецца) Міністэрствам юстыцыі.

6. Пры ліквідацыі партыі па рашэнні яе вышэйшага органа на працягу трох рабочых дзён пасля даты прыняцця рашэння аб ліквідацыі партыі ліквідацыйная камісія (ліквідатар) абавязана (абавязаны) у пісьмовай форме паведаміць аб гэтым Міністэрству юстыцыі з дадаткам копіі такога рашэння з указаннем у ім звестак аб парадку і тэрмінах ліквідацыі, прызначэнні ліквідацыйнай камісіі, яе складзе ці прызначэнні ліквідатара.

7. Звесткі аб тым, што партыя знаходзіцца ў працэсе ліквідацыі, аб парадку і тэрміне заявы патрабаванняў яе крэдыторамі размяшчаюцца ў глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт на афіцыйным сайце юрыдычнага навукова–практычнага часопіса «Юстыцыя Беларусі» з наступным апублікаваннем у дадатку да названага часопіса ў парадку, устаноўленым Урадам.

8. На падставе дакументаў, указаных у пункце 6 гэтага артыкула, Міністэрства юстыцыі:

8.1. на працягу трох працоўных дзён з дня атрымання гэтых дакументаў уносіць у Адзіны дзяржаўны рэгістр юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў звесткі аб тым, што партыя знаходзіцца ў працэсе ліквідацыі;

8.2. не пазней за працоўны дзень, які ідзе за днём атрымання гэтых дакументаў, накіроўвае апавяшчэнне аб пачатку працэдуры ліквідацыі партыі падатковым, мытным органам, органам Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь, архівам мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў (іншаму архіву ў адпаведнасці з заканадаўствам аб архівах). Указаныя органы (арганізацыі) прадстаўляюць у Міністэрства юстыцыі ў парадку, устаноўленым Урадам, дакументы, прадугледжаныя пунктамі 10.2 і 10.3 гэтага артыкула.

9. Пасля зацвярджэння ліквідацыйнага балансу ліквідацыйная камісія (ліквідатар) прадстаўляе ў Міністэрства юстыцыі:

9.1. заяву аб выключэнні партыі з Адзінага дзяржаўнага рэгістра юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў;

9.2. ліквідацыйны баланс, падпісаны чальцамі ліквідацыйнай камісіі (ліквідатарам) і зацверджаны кіраўнічым органам партыі;

9.3. арыгіналы статута партыі і пасведчанні аб дзяржаўнай рэгістрацыі партыі або заяву аб іх страце з дадаткам звестак аб публікацыі аб'яў аб іх страце;

9.4. пячатку партыі або заяву аб яе нявырабе, або звесткі аб публікацыі аб'явы аб яе страце.

10. Міністэрства юстыцыі ўносіць запісы ў Адзіны дзяржаўны рэгістр юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў аб выключэнні з яго партыі пры наяўнасці ў сукупнасці наступных умоваў:

10.1. ліквідацыйнай камісіяй (ліквідатарам) прадстаўленыя неабходныя для ліквідацыі партыі дакументы, прадугледжаныя пунктам 9 гэтага артыкула;

10.2. падатковымі, мытнымі органамі, органамі Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь не прадстаўленыя даведкі аб наяўнасці (адсутнасці) запазычанасці партыі перад бюджэтам, у тым ліку па плацяжах, якія спаганяюцца мытнымі органамі, органамі Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь, інфармацыя аб наяўнасці абавязкаў, не спыненых перад мытнымі органамі, і з дня накіравання Міністэрствам юстыцыі апавяшчэння аб пачатку працэдуры ліквідацыі партыі прайшло не менш за трыццаць пяць працоўных дзён, альбо прадстаўленыя даведкі аб адсутнасці адпаведнай запазычанасці і інфармацыя аб адсутнасці абавязацельстваў, не спыненых перад мытнымі органамі;

10.3. архівамі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў (іншаму архіву ў адпаведнасці з заканадаўствам аб архівах) прадстаўленыя звесткі аб здачы на захоўванне дакументаў партыі.

11. Пры наяўнасці ў партыі непагашанай запазычанасці, абавязацельстваў перад падатковымі, мытнымі органамі, органамі Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь выключэнне партыі з Адзінага дзяржаўнага рэгістра юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў праводзіцца толькі пасля прадстаўлення дакументаў, якія пацвярджаюць пагашэнне такой запазычанасці, спыненне абавязацельстваў перад органамі мытні.

12. У выпадку прадстаўлення ў Міністэрства юстыцыі ў тэрмін, вызначаны пунктам 10.2 гэтага артыкула, органамі (арганізацыямі), указанымі ў пункце 11 гэтага артыкула, інфармацыі аб немагчымасці прадстаўлення адпаведных даведак партыя не можа быць выключана з Адзінага дзяржаўнага рэгістра юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў на працягу шасці месяцаў з дня атрымання гэтымі органамі (арганізацыямі) апавяшчэння аб пачатку праэдуры ліквідацыі партыі. Калі па заканчэнні гэтага тэрміна не прадстаўленыя дакументы, прадугледжаныя пунктам 10.2 гэтага артыкула, Міністэрства юстыцыі прымае рашэнне аб унясенні ў Адзіны дзяржаўны рэгістр юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў запісы аб выключэнні з яго партыі.

13. Міністэрства юстыцыі ў дзесяцідзённы тэрмін з даты прыняцця рашэння аб унясенні ў Адзіны дзяржаўны рэгістр юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў запісу аб выключэнні з яго партыі паведамляе аб гэтым у падатковыя органы, органы дзяржаўнай статыстыкі, органы Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 4. ПРАВЫ І ЎМОВЫ ДЗЕЙНАСЦІ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ

### Артыкул 19. Правы палітычных партый

1. Палітычныя партыі з дня іх дзяржаўнай рэгістрацыі маюць права:

1.1. свабодна весці сваю дзейнасць у межах, прадугледжаных Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, гэтым Законам і іншымі нарматыўнымі прававымі актамі;

1.2. свабодна распаўсюджваць інфармацыю аб сваёй дзейнасці, прапагандаваць свае ідэі, мэты і праграмы;

1.3. карыстацца дзяржаўнымі сродкамі масавай інфармацыі ў парадку, устаноўленым заканадаўствам;

1.4. засноўваць уласныя сродкі масавай інфармацыі і ажыццяўляць выдавецкую дзейнасць у парадку, устаноўленым заканадаўствам;

1.5. праводзіць сходы, мітынгі, дэманстрацыі і іншыя масавыя мерапрыемствы;

1.6. абараняць правы і законныя інтарэсы, а таксама прадстаўляць законныя інтарэсы партыі, сваіх сяброў і прыхільнікаў у органах дзяржаўнай улады і мясцовага самакіравання, а таксама іншых арганізацыях;

1.7. удзельнічаць у выбарах у парадку, устаноўленым заканадаўствам;

1.8. падтрымліваць сувязі з іншымі палітычнымі партыямі, у тым ліку іншых дзяржаваў, іншымі арганізацыямі.

1.9. мець крыніцу даходу і валодаць маёмасцю ў адпаведнасці з законам.

2. Палітычныя партыі могуць мець іншыя правы, прадугледжаныя гэтым Законам і іншымі нарматыўнымі прававымі актамі.

**Артыкул 20. Права на стварэнне кааліцый, саюзаў палітычных партый**

1. Палітычныя партыі ў адпаведнасці з Грамадзянскім кодэксам Рэспублікі Беларусь маюць права ствараць асацыяцыі ці саюзы палітычных партый.

2. Дзяржаўная рэгістрацыя асацыяцый (саюзаў) палітычных партый ажыццяўляецца ў агульным парадку, вызначаным заканадаўствам для дзяржаўнай рэгістрацыі суб'ектаў гаспадарання.

3. На асацыяцыі (саюзы) партый не распаўсюджваюцца правы партый па ўдзеле ў выбарах і фінансаванні партый.

4. Палітычныя партыі маюць права ствараць кааліцыі палітычных партый, якія не з’яўляюцца юрыдычнымі асобамі.

5. Кааліцыі партый існуюць на працягу тэрміну, устаноўленага пры іх фармаванні, які пасля можа быць падоўжаны ці паменшаны.

6. Кааліцыі, створаныя для выбарчых мэт, рэгулююцца палажэннямі Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 21. Міжнародныя сувязі палітычных партый**

1. Палітычныя партыі ў адпаведнасці з іх статутамі маюць права падтрымліваць сувязі з палітычнымі партыямі, іншымі некамерцыйнымі арганізацыямі замежных дзяржаў, міжнароднымі і міжурадавымі арганізацыямі, заключаць з імі дамовы аб супрацоўніцтве і ажыццяўляць іншыя меры, якія не супярэчаць законам і міжнародным дамовам Рэспублікі Беларусь.

2. У адпаведнасці са сваімі статутамі партыі могуць засноўваць міжнародныя саюзы або ўступаць у якасці калектыўных чальцоў у міжнародныя некамерцыйныя аб'яднанні, за выключэннем рэлігійных, мэты або дзейнасць якіх не супярэчыць гэтаму Закону.

3. Палітычныя партыі не могуць заключаць пагадненні ці здзяйсняць якія–небудзь іншыя здзелкі, якія ставяць партыю ў падпарадкаванае ці залежнае становішча ў дачыненні да якой–небудзь іншай замежнай партыі ці арганізацыі.

# ГЛАВА 5. СРОДКІ ДЫ ІНШАЯ МАЁМАСЦЬ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ

**Артыкул 22. Маёмасць палітычнай партыі**

1. Палітычная партыя можа мець ва ўласнасці любую маёмасць, неабходную для матэрыяльнага забеспячэння яе дзейнасці, за выключэннем аб'ектаў, якія, згодна з законам, могуць знаходзіцца толькі ва ўласнасці дзяржавы.

2. Уласнікам маёмасці партыі, у тым ліку маёмасці, якая знаходзіцца ў арганізацыйных структур гэтай партыі, з'яўляецца партыя. Арганізацыйныя структуры партыі маюць права распараджацца маёмасцю партыі ў межах, якія вызначаюцца статутам гэтай партыі.

3. Арганізацыйныя структуры партыі, надзеленыя правамі юрыдычнай асобы, маюць асобны баланс і бягучы (разліковы) банкаўскі рахунак, а таксама могуць мець іншыя рахункі ў банках, нябанкаўскіх крэдытна–фінансавых арганізацыях, зарэгістраваных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

4. Крыніцамі грашовых сродкаў ды іншай маёмасці палітычнай партыі могуць з'яўляцца:

4.1. уступныя і сяброўскія ўнёскі;

4.2. ахвяраванні, дарэнні і атрыманне спадчыны;

4.3. даходы ад прадпрымальніцкай дзейнасці, якая ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым артыкулам 25 гэтага Закона;

4.4. дзяржаўныя субсідыі;

4.5. іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам.

5. Сябры партыі не маюць правоў на маёмасць, у тым ліку на грашовыя сродкі партыі.

6. Партыя не адказвае па абавязацельствах сваіх сяброў. Сябры партыі не адказваюць па абавязацельствах партыі, сябрамі якой яны з'яўляюцца.

**Артыкул 23. Уступныя і сяброўскія ўнёскі палітычнай партыі**

1. Наяўнасць, памер і парадак збору ўступных і сяброўскіх унёскаў вызначаюцца статутам партыі.

2. Сябра партыі можа выплачваць сяброўскія ўнёскі толькі з уласнага даходу. Сябру партыі забаронена выплата сяброўскіх унёскаў ад імя іншых сяброў партыі.

3. Партыя сваім статутам і палажэннямі можа прадугледзець вызваленне сябра партыі ад выплаты сяброўскіх унёскаў.

**Артыкул 24. Ахвяраванні на карысць палітычнай партыі**

1. Грашовыя ахвяраванні на карысць партыі могуць быць зробленыя па тэлефоне, праз Інтэрнэт, банкаўскім пералікам або іншымі спосабамі, якія дазволяць органам, якія кантралююць фінансаванне партый, вызначыць ахвярадаўцу.

2. Калі агульны кошт ахвяравання, зробленага адным і тым жа ахвярадаўцам на працягу аднаго года, перавышае 200 базавых велічынь, з ім павінна быць заключаная дамова аб ахвяраванні.

3. Ахвяраванні, зробленыя партыі фізічнай асобай на працягу бюджэтнага года, не могуць перавышаць суму ў 10 000 базавых велічыняў. Калі фізічная асоба з'яўляецца

сябрам партыі, у названую гранічную суму ўключаецца таксама сума выплачаных ім на працягу года сяброўскіх унёскаў.

4. Ахвяраванні, зробленыя партыі юрыдычнай асобай на працягу бюджэтнага года, не могуць перавышаць суму ў 25 000 базавых велічыняў.

5. Забараняецца выкарыстанне партыяй атрыманых ахвяраванняў, якія не адпавядаюць патрабаванням гэтага Закона. Калі такія ахвяраванні атрыманыя і ахвярадаўца вядомы, партыя абавязаная на працягу пяці працоўных дзён з дня атрымання такога ахвяравання вярнуць ахвяраванне дарыльшчыку, з указаннем прычыны адмовы ад прыняцця ахвяравання. У выпадку неўстанаўлення ахвярадаўцы партыя павінна пералічыць ахвяраванне ў дзяржаўны бюджэт на працягу дзесяці працоўных дзён.

**Артыкул 25. Прадпрымальніцкая дзейнасць палітычных партый**

1. Палітычная партыя і яе арганізацыйныя структуры маюць права займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю ад уласнай асобы або выступаць у якасці заснавальніка камерцыйных арганізацый пры ўмове, калі яны займаюцца выключна наступнымі відамі дзейнасці:

1.1. выдавецкая дзейнасць;

1.2. паліграфічная дзейнасць і тыражаванне запісаных носьбітаў інфармацыі;

1.3. продаж выдавецкай і паліграфічнай прадукцыі, запісаных носьбітаў інфармацыі;

1.4. дзейнасць у сферы інфармацыйнага абслугоўвання;

1.5. рэкламная дзейнасць і вывучэнне кан'юнктуры рынку;

1.6. здача ў наём уласнай і арэнднай нерухомай маёмасці;

1.7. адукацыя, за выключэннем дашкольнай, пачатковай, сярэдняй, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі;

1.8. арганізацыя культурных, сацыяльных, спартовых, выставачных і забаўляльных мерапрыемстваў;

1.9. вытворчасць і продаж сувенірнай прадукцыі з выявай сімволікі і (або) найменнем партыі.

2. Даходы ад прадпрымальніцкай дзейнасці партыі, яе арганізацыйных структур і камерцыйных арганізацый, заснавальнікамі якіх яны з'яўляюцца, не могуць пераразмяркоўвацца паміж сябрамі партыі і павінны выкарыстоўвацца толькі ў мэтах, прадугледжаных яе статутам.

**Артыкул 26. Абмежаванні ў фінансаванні палітычных партый**

1. Палітычным партыям і створаным імі юрыдычным асобам забараняецца прама або ўскосна атрымліваць грашовыя сродкі ды іншую маёмасць ад:

1.1. замежных дзяржаваў, замежных арганізацый, міжнародных арганізацый, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства;

1.2. арганізацый, заснавальнікамі (удзельнікамі, уласнікамі маёмасці) якіх з'яўляюцца замежныя дзяржавы, замежныя арганізацыі, міжнародныя арганізацыі, замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства;

1.3. дзяржаўных органаў, калі іншае не ўстаноўлена гэтым Законам;

1.4. арганізацый, у статутных фондах якіх звыш за 25 адсоткаў доляў (простых (звычайных) або іншых галасуючых акцый) знаходзяцца ва ўласнасці Рэспублікі Беларусь, і (або) яе адміністрацыйна–тэрытарыяльных адзінак, і (або) юрыдычных асоб дзяржаўнай формы ўласнасці;

1.5. ананімных ахвярадаўцаў;

1.6. грамадзян, якія не дасягнулі васемнаццацігадовага ўзросту;

1.7. рэлігійных арганізацый, а таксама юрыдычных асоб, заснаваных рэлігійнымі арганізацыямі.

2. Не лічыцца незаконным атрыманне сродкаў на ўдзел прадстаўнікоў палітычных партый у з'ездах, навуковых канферэнцыях ды іншых мерапрыемствах, у тым ліку за мяжой, ад прымаючага боку.

3. Грашовыя сродкі палітычнай партыі могуць размяшчацца толькі на рахунках у банках і нябанкаўскіх крэдытна–фінансавых арганізацыях, зарэгістраваных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

4. Палітычным партыям забараняецца захоўваць грашовыя сродкі, каштоўныя металы ды іншыя каштоўнасці ў банках і нябанкаўскіх крэдытна–фінансавых арганізацыях, якія знаходзяцца на тэрыторыі замежных дзяржаваў.

5. Грашовыя сродкі ды іншая маёмасць, атрыманыя партыямі і створанымі імі юрыдычнымі асобамі з крыніц, забароненых гэтым артыкулам, павінны быць перададзеныя ў даход дзяржавы. Пры адмове ад добраахвотнай перадачы гэтыя сродкі і маёмасць спаганяюцца ў даход дзяржавы ў судовым парадку па заяве дзяржаўных органаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўны кантроль за фінансаваннем палітычных партый.

**Артыкул 27. Справаздачнасць аб маёмасці, даходах і расходах палітычнай партыі**

1. Палітычныя партыі ў адпаведнасці з зацверджаным Урадам Рэспублікі Беларусь палажэннем штогод да 31 сакавіка прадстаўляюць справаздачы аб маёмасці, даходах і расходах.

2. Гадавыя справаздачы аб маёмасці, даходах і расходах палітычных партый лічацца публічнымі дакументамі і штогод да 30 чэрвеня года, наступнага за справаздачным, даводзяцца партыяй да ўсеагульнага ведама шляхам размяшчэння ў сродках масавай інфармацыі або на сваіх афіцыйных сайтах у глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт (пры іх наяўнасці) або шляхам накіравання па месцы дзяржаўнай рэгістрацыі ў Міністэрства юстыцыі для наступнага размяшчэння на афіцыйным сайце органа юстыцыі ў глабальнай кампутарнай сетцы Інтэрнэт.

3. Палітычныя партыі, гадавы даход або гадавыя выдаткі якіх перавышаюць 10000 базавых велічынь, абавязаныя па меншай меры раз на тры гады праводзіць аўдыт справаздач аб маёмасці, даходах і расходах. Аўдытарская справаздача з'яўляецца дадаткам да справаздачы аб маёмасці, даходах і выдатках.

4. Палітычная партыя мае права заключаць дамову на правядзенне знешняга незалежнага аўдыту справаздачнасці аб маёмасці, даходах і расходах з той жа аўдытарскай фірмай або аўдытарам не больш за тры гады запар.

5. Аўдытар выбіраецца палітычнай партыяй з ліку асоб, якія апошнія пяць гадоў не былі сябрамі партыі, а таксама не выконвалі абавязкі бухгалтара або адказнага за фінансы ў палітычнай партыі, у якой праводзіцца аўдыт.

6. Аўдыт справаздач аб маёмасці, даходах і расходах ажыццяўляецца ў адпаведнасці з палажэннямі заканадаўства.

## ГЛАВА 6. ДЗЯРЖАЎНАЕ ФІНАНСАВАННЕ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ

**Артыкул 28. Формы дзяржаўнага фінансавання палітычных партый**

1. Фінансаванне палітычных партый робіцца за кошт сродкаў дзяржаўнага бюджэту ў межах сродкаў, прадугледжаных на гэтыя мэты дзяржаўным бюджэтам на чарговы фінансавы год, шляхам:

1.1. прадастаўлення партыям у адпаведнасці з гэтым законам субсідый на іх статутную дзейнасць, не звязаную з іх удзелам у выбарах дэпутатаў Сойма, выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і выбарах дэпутатаў прадстаўнічых органаў мясцовага самакіравання;

1.2. прадастаўлення партыям у адпаведнасці з Выбарчым кодэксам Рэспублікі Беларусь субсідый, звязаных з фінансаваннем іх удзелу на чарговых і пазачарговых выбарах дэпутатаў Сойма;

1.3. прадастаўлення партыям іншых субсідый у адпаведнасці з законам.

**Артыкул 29. Падставы для прадастаўлення палітычным партыям субсідыі на статутную дзейнасць**

1. Права на атрыманне субсідыі з дзяржаўнага бюджэту на фінансаванне статутнай дзейнасці маюць палітычныя партыі, якія:

1.1. унесеныя ў Адзіны дзяржаўны рэгістр юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў;

1.2. адпавядаюць патрабаванням заканадаўства ў дачыненні да колькасці сяброў палітычнай партыі;

1.3. у дачыненні да якіх не распачата працэдура рэарганізацыі або ліквідацыі;

1.4. чые кандыдаты атрымалі не менш за 3 адсоткі галасоў ад колькасці выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні на апошніх чарговых або пазачарговых выбарах у Сойм, і (або) чые кандыдаты атрымалі не менш за 3 адсоткі галасоў ад колькасці выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у галасаванні на апошніх чарговых або пазачарговых выбарах у прадстаўнічыя органы мясцовага самакіравання.

2. Падставай для выплаты субсідыі з'яўляецца заява аб выплаце субсідыі на чарговы фінансавы год, пададзеная кіраўнічым органам палітычнай партыі, упаўнаважаным яе статутам прадстаўляць яе ў адносінах з трэцімі асобамі, па форме і ў тэрміны, устаноўленыя Урадам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 30. Парадак разліку сумы субсідыі на статутную дзейнасць палітычнай партыі**

1. Памер асігнаванняў на субсідаванне статутнай дзейнасці палітычных партый зацвярджаецца законам аб дзяржаўным бюджэце ў памеры, які не перавышае 0,2 адсоткі даходаў дзяржаўнага бюджэту, і размяркоўваецца наступным чынам:

1.1. 50 адсоткаў – палітычным партыям прапарцыйна колькасці галасоў, атрыманых на апошніх чарговых або пазачарговых выбарах у Сойм;

1.2. 50 адсоткаў – палітычным партыям прапарцыйна колькасці галасоў, атрыманых на апошніх чарговых або пазачарговых выбарах у прадстаўнічыя органы мясцовага самакіравання.

2. Памер субсідыі з дзяржаўнага бюджэту на фінансаванне статутнай дзейнасці палітычнай партыі вызначаецца ў наступным парадку:

2.1. вызначаецца агульная колькасць галасоў выбаршчыкаў на апошніх чарговых або пазачарговых выбарах у Сойм, аддадзеных за кандыдатаў тых палітычных партый, якім у адпаведнасці з артыкулам 29 гэтага закона могуць быць выдзеленыя асігнаванні дзяржаўнага бюджэту на фінансаванне статутнай дзейнасці палітычнай партыі. Для партый, якія набралі больш за 30 адсоткаў галасоў улічваецца толькі колькасць галасоў, якія складаюць 30 адсоткаў галасоў, аддадзеных за кандыдатаў палітычнай партыі;

2.2. разлічваецца фінансавы каэфіцыент аднаго голасу выбаршчыка на выбарах у Сойм шляхам дзялення паловы асігнаванняў дзяржаўнага бюджэту, прызначаных для фінансавання статутнай дзейнасці палітычных партый, на агульную колькасць галасоў выбаршчыкаў, разлічаную ў адпаведнасці з падпунктам 2.1 гэтага артыкула;

2.3. вызначаецца агульная колькасць галасоў выбаршчыкаў на апошніх чарговых ці пазачарговых выбарах у прадстаўнічыя органы мясцовага самакіравання, аддадзеных за кандыдатаў тых палітычных партый, якім у адпаведнасці з артыкулам 29 гэтага закона могуць быць выдзеленыя асігнаванні дзяржаўнага бюджэту на фінансаванне статутнай дзейнасці палітычнай партыі. Для партый, якія набралі больш за 30 адсоткаў галасоў, улічваецца толькі колькасць галасоў, якія складаюць 30 адсоткаў галасоў, аддадзеных за кандыдатаў палітычнай партыі;

2.4. разлічваецца фінансавы каэфіцыент аднаго голасу выбаршчыка на выбарах у прадстаўнічыя органы мясцовага самакіравання шляхам дзялення паловы асігнаванняў дзяржаўнага бюджэту, прызначаных для фінансавання статутнай дзейнасці палітычных партый, на агульную колькасць галасоў выбаршчыкаў, разлічаную ў адпаведнасці з падпунктам 2.3 гэтага артыкула;

2.5. памер субсідыі з дзяржаўнага бюджэту на фінансаванне статутнай дзейнасці палітычнай партыі вызначаецца як сума, разлічаная па выніках выбараў у Сойм шляхам памнажэння фінансавага каэфіцыента аднаго голасу выбаршчыка на выбарах у Сойм на колькасць галасоў выбаршчыкаў, якія аддалі свае галасы за кандыдатаў гэтай палітычнай партыі на выбарах у Сойм, але не менш за 3 адсоткі і не больш за 30 адсоткаў галасоў, і сума, разлічаная па выніках выбараў у органы мясцовага самакіравання шляхам памнажэння фінансавага каэфіцыента аднаго голаса выбаршчыка на выбарах у прадстаўнічыя органы мясцовага самакіравання на колькасць галасоў выбаршчыкаў, якія аддалі свае галасы за кандыдатаў гэтай палітычнай партыі на выбарах у прадстаўнічыя органы мясцовага самакіравання, але не менш за 3 адсоткі і не больш за 30 адсоткаў галасоў.

3. У выпадку, калі субсідыя разлічваецца для палітычных партый у складзе выбарчай кааліцыі, колькасць атрыманых галасоў размяркоўваецца паміж палітычнымі партыямі прапарцыйна колькасці кандыдатаў у кааліцыйным спісе, за выключэннем выпадкаў, калі іншае непасрэдна ўказана ў пагадненні аб фармаванні выбарчай кааліцыі.

4. У выпадку зліцця палітычнай партыі з іншай партыяй або партыямі памер субсідыі новай партыі налічваецца ў памеры, роўным суме субсідый, устаноўленых для партый да зліцця.

5. У выпадку рэарганізацыі палітычнай партыі, якая мае права на дзяржаўную субсідыю на статутную дзейнасць, названае права перадаецца яе правапераемніку.

6. У выпадку спынення дзейнасці палітычнай партыі, якая карыстаецца субсідыяй на статутную дзейнасць, належныя ёй сумы пераразмяркоўваюцца іншым палітычным партыям, якія карыстаюцца правам на субсідыю на статутную дзейнасць, у адпаведнасці з гэтым артыкулам .

7. У год выбараў у Сойм і (або) прадстаўнічыя органы мясцовага самакіравання памер дзяржаўнай субсідыі на фінансаванне статутнай дзейнасці палітычнай партыі пералічваецца з першай даты месяца, наступнага за аб'яўленнем канчатковых вынікаў выбараў.

**Артыкул 31. Парадак прадастаўлення палітычным партыям дзяржаўных субсідый на статутную дзейнасць**

Парадак прадастаўлення палітычным партыям дзяржаўных субсідый на статутную дзейнасць устанаўліваецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

**Артыкул 32. Выкарыстанне дзяржаўных субсідый на статутную дзейнасць палітычных партый**

1. Дзяржаўныя субсідыі на статутную дзейнасць палітычных партый даюцца на выдаткі, непасрэдна звязаныя з наступнымі відамі дзейнасці:

1.1. адукацыя і асвета;

1.2. распаўсюджванне інфармацыі і рэкламы;

1.3. правядзенне даследаванняў і вывучэнне грамадскай думкі;

1.4. мерапрыемствы, накіраваныя на заахвочванне палітычнага ўдзелу;

1.5. уцягванне асоб, якія не з'яўляюцца сябрамі, у дзейнасць палітычнай партыі;

1.6. падтрыманне кантактаў з партыямі замежных дзяржаваў; выплата сяброўскіх унёскаў у міжнародныя арганізацыі, сябрам якіх з'яўляецца партыя;

1.7. арганізацыя і правядзенне публічных мерапрыемстваў;

1.8. падрыхтоўка аналітычных матэрыялаў і праектаў нарматыўных прававых актаў;

1.9. адміністрацыйна–гаспадарчае і матэрыяльна–тэхнічнае забеспячэнне дзейнасці партыі і яе арганізацыйных структур, у тым ліку расходы на ўтрыманне персаналу, выплату падаткаў і збораў, прадстаўнічыя выдаткі.

2. Дзяржаўныя субсідыі, выкарыстаныя на іншыя, чым прадугледжаныя ў пункце 1 гэтага артыкула віды дзейнасці, вяртаюцца ў дзяржаўны бюджэт.

3. Кантроль за расходаваннем дзяржаўных субсідый на статутную дзейнасць палітычных партый ажыццяўляецца ўпаўнаважанымі дзяржаўнымі органамі ў адпаведнасці з заканадаўствам.

**Артыкул 33. Спыненне прадастаўлення дзяржаўных субсідый на статутную дзейнасць палітычнай партыі**

1. Дзяржаўнае субсідаванне статутнай дзейнасці палітычнай партыі спыняецца па рашэнні Міністэрства фінансаў у выпадку:

1.1. непрадстаўлення палітычнай партыяй справаздачы аб маёмасці, даходах і расходах ва ўстаноўлены гэтым Законам тэрмін;

1.2. прадстаўленне палітычнай партыяй справаздачы аб маёмасці, даходах і расходах, афармленай з грубым парушэннем устаноўленых патрабаванняў або справаздачы, якая змяшчае недакладныя звесткі аб маёмасці палітычнай партыі, даходах або расходах палітычнай партыі ў памеры больш за 20 базавых велічынь;

1.3. заявы палітычнай партыі аб частковай адмове на ўказаны ў заяве тэрмін ад атрымання дзяржаўных субсідый;

1.4. страты права на атрыманне субсідыі з дзяржаўнага бюджэту на фінансаванне статутнай дзейнасці партыі ў адпаведнасці з пунктам 1 артыкула 29 гэтага Закона.

2. Прадастаўленне дзяржаўных субсідый на статутную дзейнасць палітычнай партыі аднаўляецца з пачатку месяца, наступнага за месяцам, у якім прынята рашэнне аб аднаўленні дзяржаўнага фінансавання статутнай дзейнасці палітычнай партыі ў сувязі з устраненнем партыяй прычын, якія абумовілі спыненне дзяржаўнага фінансавання яе статутнай дзейнасці.

3. Грашовыя сродкі, не атрыманыя палітычнай партыяй з прычыны спынення дзяржаўнага фінансавання яе статутнай дзейнасці, кампенсацыі або вяртанню палітычнай партыі не падлягаюць.

## ГЛАВА 7. АДКАЗНАСЦЬ ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ

### Артыкул 34. Кантроль за дзейнасцю палітычных партый

Кантроль за адпаведнасцю дзейнасці палітычных партый і яе арганізацыйных структур заканадаўству ажыццяўляецца дзяржаўнымі органамі і іншымі дзяржаўнымі арганізацыямі ў межах іх кампетэнцыі.

### Артыкул 35. Меры адказнасці

1. За парушэнне Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, гэтага Закона, іншых нарматыўных прававых актаў і (або) статута ў адносінах да палітычнай партыі могуць быць прыменены наступныя меры адказнасці:

1.1. пісьмовае папярэджанне;

1.2. прыпыненне дзейнасці партыі;

1.3. ліквідацыя партыі.

2. Партыя, якая нанесла шкоду асобе або маёмасці фізічнай асобы, а таксама маёмасці юрыдычнай асобы, абавязана кампенсаваць яе ў парадку, устаноўленым заканадаўствам.

### Артыкул 36. Пісьмовае папярэджанне

1. У выпадку ўчынення палітычнай партыяй дзеянняў, якія парушаюць Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, гэты Закон, іншыя нарматыўныя прававыя акты і (або) статут партыі, акрамя выпадкаў, калі парушэнне цягне за сабой ліквідацыю партыі па рашэнні суда, адпаведныя органы, да вядзення якіх адносіцца кантроль за дзейнасцю палітычных партый, выносяць партыі пісьмовае папярэджанне.

2. Пісьмовае папярэджанне не пазней за трохдзённы тэрмін пасля яго вынясення выдаецца або накіроўваецца па пошце кіраўнічаму органу партыі з указаннем дапушчаных парушэнняў і тэрміну іх устаранення, які складае не менш за два месяцы.

3. Пісьмовае папярэджанне ў месячны тэрмін пасля яго атрымання можа быць абскарджана ў судзе.

4. Партыя абавязаная пісьмова паведаміць у орган, які вынес папярэджанне, аб устараненні парушэнняў, якія паслужылі падставай для вынясення пісьмовага папярэджання, і прадставіць пацвярджальныя дакументы не пазней за трохдзённы тэрмін па заканчэнні тэрміну ўстаранення парушэнняў, устаноўленага ў пісьмовым папярэджанні.

**Артыкул 37. Прыпыненне дзейнасці палітычнай партыі**

1. Дзейнасць палітычнай партыі можа быць прыпынена на тэрмін ад аднаго да шасці месяцаў рашэннем суда па заяве органа, які вынес пісьмовае папярэджанне партыі, калі партыя ва ўстаноўленыя тэрміны не ліквідавала парушэнняў, якія паслужылі падставай для вынясення пісьмовага папярэджання.

2. Орган, які вынес папярэджанне, мае права падаць у суд заяву аб прыпыненні дзейнасці партыі, калі пісьмовае папярэджанне ва ўстаноўленым парадку не было абскарджана ў судзе або было абскарджана і прызнана судом абгрунтаваным.

3. Прыпыненне дзейнасці партыі ў перыяд з дня афіцыйнага апублікавання рашэння аб назначэнні выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, дэпутатаў Сойма, дэпутатаў прадстаўнічых органаў мясцовага самакіравання да дня афіцыйнага апублікавання вынікаў адпаведных выбараў не дапускаецца.

4. У выпадку прыпынення дзейнасці партыі забараняецца ажыццяўляць любую дзейнасць, за выключэннем дзейнасці, накіраванай на ўстараненне парушэнняў, якія паслужылі падставай для прыпынення дзейнасці, на працягу ўсяго тэрміну, устаноўленага рашэннем суда.

5. Партыі, яе арганізацыйным структурам забараняецца ў выпадку прыпынення іх дзейнасці карыстацца рахункамі ў банках, нябанкаўскіх крэдытна–фінансавых арганізацыях, за выключэннем ажыццяўлення разлікаў па грамадзянска–прававых і працоўных дамовах, плацяжоў у дзяржаўны і (або) мясцовыя бюджэты, уключна з дзяржаўнымі мэтавымі бюджэтнымі фондамі, у дзяржаўныя пазабюджэтныя фонды, а таксама за выключэннем разлікаў, звязаных з кампенсацыяй шкоды, прычыненай дзеяннямі партыі, яе арганізацыйных структур.

6. Калі на працягу тэрміну прыпынення дзейнасці партыі, устаноўленага рашэннем суда, парушэнні, якія паслужылі падставай для прыпынення яе дзейнасці, будуць ліквідаваныя, то пасля заканчэння ўстаноўленага тэрміну партыя аднаўляе сваю дзейнасць пры ўмове пісьмовага паведамлення ў орган, які падаў іск у суд, аб устараненні названых парушэнняў з прадстаўленнем дакументаў, якія гэта пацвярджаюць.

7. Калі прычына прыпынення дзейнасці партыі не будзе ліквідаваная на працягу аднаго года, орган, які ініцыяваў прыпыненне дзейнасці партыі, павінен звярнуцца ў Міністэрства юстыцыі або Генеральную пракуратуру Рэспублікі Беларусь з прапановай падаць у суд іск да партыі аб ліквідацыі.

**Артыкул 38. Ліквідацыя палітычнай партыі па рашэнні суда**

1. Палітычная партыя ліквідуецца па рашэнні суда ў выпадку:

1.1. выяўлення на працягу трох гадоў з дня дзяржаўнай рэгістрацыі партыі парушэнняў гэтага Закона, якія носяць неўстаранімы характар, дапушчаных з боку яе заснавальнікаў пры дзяржаўнай рэгістрацыі партыі;

1.2. пераследу мэтаў або ажыццяўлення дзейнасці, абмежаванай артыкулам 6 гэтага Закона;

1.3. неўстаранення парушэнняў, якія паслужылі падставай для прыпынення дзейнасці партыі ў тэрмін, устаноўлены рашэннем суда;

1.4. калі на працягу дзевяці гадоў запар партыя не вылучае кандыдатаў ні на якіх выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, у парламент ці прадстаўнічыя органы мясцовага самакіравання;

1.5. калі на працягу трох паслядоўных гадоў партыя не падае свае справаздачы, прадугледжаныя гэтым Законам.

3. Заява аб ліквідацыі палітычнай партыі падаецца ў суд Міністэрствам юстыцыі ці Генеральнай пракуратурай Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 8. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

**Артыкул 39. Уступленне гэтага Закона ў сілу**

Гэты Закон уступае ў сілу з дня яго афіцыйнага апублікавання.

**Артыкул 40. Дадатковыя гарантыі дзейнасці палітычных партый**

Палітычныя партыі, зарэгістраваныя да прыняцця гэтага закона, захоўваюць сваю правадольнасць.